**Сцэнарый свята “Навагоднія прыгоды” для дзяцей сярэдняй групы (4-5 гадоў)**

**Святлана Іванаўна Райбе,**
музычны кіраўнік
вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі
дзіцячага сада №4 Смаргоні

**Новы год – самае чароўнае, радаснае і таямнічае свята для дзяцей. Яны чакаюць яго з нецярпеннем, верачы ў казку і цуд. Прапануем сцэнарый свята, які дапаможа выхавацелям, музычным кіраўнікам арганізаваць і правесці яго незвычайна і цікава.**

**Мэта:** стварэнне ўмоў для развіцця творчых здольнасцей выхаванцаў праз актыўную дзейнасць у сюжэтна-гульнявой праграме.

**Задачы:**

– фарміраваць уяўленне аб зіме і свяце, звязаным з ёй;

– развіваць творчыя здольнасці, пазнавальную актыўнасць;

– стварыць атмасферу свята, выклікаць у дзяцей радасць.

**Матэрыялы і абсталяванне:** святочна ўпрыгожаная ёлка, маленькая ёлачка і святлодыёдныя агеньчыкі, веера для танцаў, бутафорскія ліхтарыкі, дзіцячыя музычныя інструменты для аркестра, два аднолькавых мяшкі, санкі. Касцюмы Дзеда Мароза, Кікімары, Лешага для дарослых.

**Папярэдняя праца:** развучванне вершаў, песень, карагодаў, танцавальных кампазіцый.

**Дзеючыя асобы:** вядучы, казачныя героі Кікімара, Лешы, Дзед Мароз – дарослыя. Сняжынкі, Гномікі, Пятрушкі, Хлапушкі, Канёк-гарбунок – дзеці.

**Ход свята**

*Пад вясёлую музыку выходзяць вядучы з хлопчыкам і дзяўчынкай.*

**Вядучы.**

Яшчэ вясна адпачывае,
Пад снегам дрэмле крыгаход.
Святло па хвілях прыбывае –
Прыйшоў на працу Новы год.
Адкрыў ён звонкае надвор’е
Прасторы – лыжам і канькам,

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

Усё – на добрае здароўе
Дзяўчынкам нашым, хлапчукам. *(Э. Агняцвет)*
**Хлопчык.**
І збываюцца нашы надзеі
Ў гэты час:
Новы год – незабыўнае свята
Для ўсіх нас. *(Т. Кляшчонак)*
**Дзяўчынка.**
Ах, як хораша навокал!
Снег блішчыць, аж слепіць вока.
Я бягу на горку рана
І катаюся на санках. *(Д. Арціменя)*
*Пад навагоднюю музыку дзеці ўваходзяць, спыняюцца вакол ёлкі.*
**Вядучы.**
Навагодні вечар зорны,
Як заўсёды Дзед Мароз.
У дзіцячы сад прасторны,
З лесу ёлачку прынёс. *(І. Шуцько)*
*Чытаюць дзеці.*
1.Уся агнямі зіхаціць,
Сёння наша ёлка.
І бліскучы снег ляжыць на яе іголках.
2. Колькі цацак і шароў
Апранула сёння.
Запрашае ўсіх сяброў
У танец навагодні.
3. Ёлка, ёлачка, цябе,
Цэлы год чакалі.
Сёння хораша дзятве
У навагодняй зале.
4.Ты пад ёлку завітай
Дзіва-песню заспявай.
Бо ў гэты час
Новы год ідзе да нас.

**Выконваецца “Навагодняя песенька”** *(муз. і сл. Д. Даўгалёва, У. Пецюкевіча)*

NG ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

**Вядучы.**
Але як, сябры, прыемна:
Дзед Мароз нас не забыў!
І на свята гэтай ёлкі
Нас так сама запрасіў!
**Дзіця.**
Ёлка, ёлка, ёлачка,
Зялёныя іголачкі.
Упрыгожана стаіш,
Але агнямі не гарыш.
**Вядучы.**
І сапраўды, не гарыць.
Дык, хутчэй збірайцеся,
Станавіцеся ў карагод.
Песняй шчырай, танцам слаўным
Мы сустрэнем Новы год!
**Дзеці выконваюць танец "Беларускі новы год!"**

*Усе сядаюць на свае месцы, пад навагоднюю музыку заходзяць Лешы і Кікімара.*

**Кікімара.** Ай, паглядзі, колькі люду ў нашым лесе?! Чаго вы так прыбраліся, што тут ў вас за свята такое?

**Дзеці.** Новы год!

**Кікімара.** Гэта і ёсць ваша ёлка-прыгажуня? Ха-ха-ха! Лешы, ляці і прынясі нашу ялінку, самую лепшую, самую найпрыгажэйшую. *(Лешы ідзе за ёлачкай.)*

**Кікімара.** А я вось і агеньчыкі прыпасла.

**Вядучы.** Дык гэта ж нашы агеньчыкі, аддай дзеткам і не псуй нам свята.

**Кікімара.** У вас свая ёлка, а ў нас свая. Але ж маглі б і падзяліцца агеньчыкамі.

*Заходзіць Лешы з маленькай ёлачкай і ставіць на сярэдзіну залы, Кікімара вешае на яе светадыёдныя агеньчыкі, водзяць карагод і напяваюць мелодыю "Расла ў лесе ёлачка".*

**Вядучы.** Дзеткі, ці добра ўпрыгожана іх ялінка? *(Не.)* Чаго не хапае ў яе святочным убранстве? *(Цацак, "дождэыка", мішуры, бусаў, вярхушачкі-зорачкі.)*

**Лешы.** І без таго наша ялінка лепшая і найпрыгажэйшая!

NG ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

**Вядучы.** Як вы сабе хочаце, але навагодняй ёлачцы патрэбна ўсё, што пералічылі дзеці.

**Лешы.** Вось так заўсёды, усе хочуць нас пакрыўдзіць.

**Вядучы.** Не будзем крыўдзіць ялінку. Падарым ёй агеньчыкі, каб і яна стварала святочны настрой. Згодны, дзеці? *(Так.)* І наша ёлка не застанецца без агеньчыкаў, бо дзеці паклапаціліся пра гэта загадзя.

**Лешы.** Затое мы спяваем лепш за вас, вось паслухайце.

*Спяваюць песню "Расла ў лесе ёлачка".*

**Вядучы.** Вы лепш паслухайце, як нашы дзеткі спяваюць.

**Дзеці выконваюць песню "Дзякуй, зіма" (***муз. Д. Шагаевай).*

**Кікімара.** І сапраўды, як прыгожа. Праўда?

**Лешы.** Так, так!

**Вядучы.** Нашы дзеткі весела спяваюць, танцуюць, і Дзед Мароз на Новы год прынясе ім падарункі, а вы нічога не ўмееце, таму застанецеся без падарункаў.

**Кікімара.** Як гэта, застанемся без падарункаў, мы яшчэ паглядзім, хто застанецца. (*Шэпчуцца гучна, каб усе чулі.)*

**Лешы.** Мы першыя пойдзем і сустрэнем Дзеда Мароза, напужаем яго так, каб пра падарункі нават не ўспомніў. *(Выходзяць.)*

**Вядучы.** Хай сабе ідуць, будзем спадзявацца, што размінуцца з Дзядулем Марозам. А вы, Сняжыначкі, давайце хуценька намяціце снегу, каб яны не знайшлі Дзеда Мароза і заблукалі.

**Сняжынка.**

Мы вясёлыя сняжынкі
І сяброуем мы з зімой,
Мы сняжынкі-балерынкі,
Мы танцуем танец свой.

**Танец "Сняжынкі з веерамі"**

**Вядучы.** Думаю, што мы такой мяцеліцай напужалі Кікімару і Лешага. А паглядзіце, хто гэта пад ёлачкай сядзіць і на нас глядзіць?

**Дзеці.** Зайка.

**Вядучы.** А што гэта ў цябе, Зайка?

**Зайка.** Гэта ў мяне падарунак ад Дзеда Мароза.

*Залятаюць Кікімара і Лешы.*

**Кікімара.** Падарунак, падарунак!

**Лешы.** Гэта наш падарунак! *(Адбірае ў Зайкі.)*

**Кікімара.** Гэта ж капуста!

**Лешы.** А можа ён усярэдзіне?

**Кікімара.** Давай распілім.*(Бяруць пілу і піляць.)*

**Лешы**. Няма нічога, абмануў нас Заяц, няма ніякага падарунка.

**Вядучы.** А што вы тут кіліце? Як вам не сорамна, Зайчыка пакрыўдзілі, падарунак адабралі. Вярніце, што забралі. Нельга браць чужое, падманваць і крыўдзіць слабейшага! Уцякайце ад нас, злыя вы. Мы ўсё раскажам Дзядулі Марозу. *(Лешы і Кікімара збягаюць.)*

**Вядучы.** А ты, Зайчык, заставайся ў нас, разам будзем сустракаць Новы год. Давайце пачытаем вершы пра Дзеда Мароза, ён пачуе і хуценька да нас прыйдзе.

**Дзеці чытаюць вершы.**

1. Дзе пушчы і балота,
Між елак і бяроз
На лыжах па сумётах
Шыбуе Дзед Мароз.

2. Зіхочуць, як карункі,
Сняжынкі ў барадзе,
А ў торбе падарункі
Дзіцячай грамадзе.

3. І радасна на свяце
І весела да слёз,
Калі у цёплай хаце
Гасцюе Дзед Мароз.

**Вядучы.** Гномікі хутчэй хадзіце, Дзеду Марозу шлях да нас пасвяціце!

**Танец гномікаў з ліхтарыкамі.**

*Пад музыку заходзіць Дзед Мароз.*

**Дзед Мароз.** Дарагія мае дзеці.
Ганны, Каці і Алесі,
Пашы, Славы і Аксаны,
Ну і іншыя таксама!
Усіх са святам я віншую
І, канечне, зычу, раю,
Каб раслі здаровымі,
Шмат чаго рабіць умелі,
Кніжкі добрыя чыталі,

NG PRESS ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

Песні добрыя спявалі,
А цяпер ў карагод
Сустракаем Новы год!

**Вядучы.** Дзядуля Мароз, мы цябе так чакалі, з усімі дзецьмі цябе гукалі, але агеньчыкі на нашай ёлачцы не гараць. Можа, ты дапаможаш, ты ж чараўнік.

**Дзед Мароз.**
Трэба за рукі нам узяцца,
Крыкнуць “ёлачка, гары”.
І на ёлцы загарацца
Розным колерам агні.
Ану, ялінка, раз, два, тры,
Святам радасці гары. (*Уключаецца гірлянда, усе пляскаюць ў далоні.)*

**Дзед Мароз.** Новы год, Новы год,
Пачынаем карагод!

**Выконваецца песня “Сёння свята”** *( муз. і сл. Я. Жабко.)*

**Дзед Мароз.** Малайчынкі, вельмі добра вы спявалі, вось прысяду, пасяджу ды на дзетак пагляджу. А хто мне верш раскажа? Калі я ішоў да вас, то чуў, як вы расказвалі вершы пра ёлачку, але ж хочацца паслухаць і пра сябе.

*Дзеці чытаюць.*

1. Ходзіць дзед белабароды
Полем, лесам, пералескам,
Засцілае рэчкі лёдам,
Брыльянцістым снежным блескам.
2. Сыпле іней на бярозы,
Туліць дрэвы лёгкім пухам,
Крые руні, травы, лозы
Белай посцілкай-кажухам.
3. Дзеда ўсюды носяць ногі,
І к нам прыйдзе на хвілінку
Адпачыць крыху з дарогі,
Важна сеўшы на ялінку.
4. А ялінка! Чаго толькі
На яе няма галінках!
Свецяць зоркі і вясёлкі
У бліскучых павуцінках.
5. Каля ялінкі карагоды,

NG PRESS ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

Песні, гутарка жывая,
А той дзед белабароды
Толькі ў вусы смех пускае.
6. Дык рассунем кола шырай,
Патанцуем на памосце,
Песняй звонкай, песняй шчырай
Прывітаем дзеда-госця. *(Я. Колас)*

**Песня “Дзякуй, зіма”** *( сл. і муз. Д. Шагаевай.)*

*(Становяцца ў рассыпную і выконваюць песню.)*

**Вядучы.** Дзядуля Мароз, дзеткі нашы вельмі кемлівыя і мы хочам з табой пагуляць ў гульню. Раз, два, тры, кола хутчэй збяры!

**Гульня “Не выпусцім”**

*Дзеці ідуць па кругу, па заканчэнні музыкі Дзед Мароз хоча выйсці з круга, дзеці хутка бяруцца за рукі і не пускаюць, гульня паўтараецца два разы.*

**Дзед Мароз.**

Адпусціце вы мяне,
Маленькія дзеткі.
Ох, люблю я паскакаць
Лепш за ўсіх на свеце.
Ногі ходзяць хадуном,
Не стаяць ні разу,
Дык давайце на свяце
Мы паскачам разам!

**Танец-гульня “Лавата”**

**Вядучы.** Дзядуля Мароз, сядзь, адпачні і на наш аркестр паглядзі, якія падрыхтавалі нашы Пятрушкі і Хлапушкі.

**Дзед Мароз.** Ай ды весялуны. Атрымлівайце мае падарункі. А дзе ж гэта мой мех? *(Шукае.)*

*Заходзяць Кікімара і Лешы, нясуць мех.*

**Кікімара.** Глянь, Дзед Мароз, мабыць, згубіў падарункі. Ха-ха-ха!

**Дзед Мароз.** А вы што тут робіце, насміхаецеся?

**Кікімара і Лешы.** Нічога! *(Засланяюць мех.)*

**Вядучы.** Як нічога, а мяшок з падарункамі дзе?

**Дзед Мароз.** Ану, паказвайце! *(Персанажы адыходзяць.)*. Так, так, падобны да майго.

*(Развязвае,з меха выскаквае Канёк-гарбунок.)*

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

**Кікімара.** А дзе ж падарункі? Як ты сюды трапіў?

**Канёк-гарбунок.** Гэты год, мой год – Коніка. Я ішоў да дзяцей на свята. А тут паднялася завіруха, мне стала холадна, бачу ляжыць мех, я туды і схаваўся.

**Лешы.** А ты казала, падарункі, падарункі!

**Кікімара.** А ты чаму схапіў, адразу не паглядзеўшы?

**Вядучы.** Пачакайце, не сварыцеся, а разам з усімі ў карагод станавіцеся, сёння ж свята – Новы год!

**Дзед Мароз.** Дык давайце, пляску пачынайце!

**Вядучы.** А выканаюць пляску "Весялуха" дзеткі з нашага харэграфічнага гуртка.

***Гурткоўцы выконваюць танец.***

**Кікімара і Лешы.** Прабачце нас. Як у вас весела. За тое, што вы нас не прагналі, мы дапаможам вам знайсці мяшок з падарункамі. Канёк-гарбунок, ты ўперад скачы. А мы за табою.

*Пад навагоднюю музыку на саначках вязуць падарункі: наперадзе Канёк-гарбунок.*

**Дзед Мароз.** Малайчынкі, хутка справіліся! Канёк-гарбунок, табе першаму, ты вельмі пастараўся.

**Кікімара і Лешы.** А нам?

**Дзед Мароз.** Дапамажыце мне і таксама атрымаеце.*(Раздае падарункі.)*

**Дзед Мароз.** Я зычу вам быць заўсёды бадзёрымі, не хварэць, а праз год зноў прыйду да вас павіншаваць і павесяліцца. Да пабачэння.

## Літаратура

1. Вучэбная праграма дашкольнай адукацыі. – Мінск:Нацыянальны інстытут адукацыі, 2023.

2. Залатая скарбонка: Хрэстаматыя для дашкольнікаў. – Мінск : Аверсэв, 2021.

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА